Одним из центральных персонажей, возглавлявших потусторонний мир, является *Воланд*. В романе он выступает в роли дьявола.

*Воланд, Велунд, Вёлунд, Вёлюнд* (*Weyland*) – персонаж мифологии и литературы Европы. С появлением христианства многие языческие боги приобрели черты дьявола или его слуг.

В романе он предстает как загадочный и харизматичный персонаж, исполняющий свои таинственные планы и испытывающий героев на прочность и искренность их убеждений.

Образ Воланда у Булгакова вдохновлен демонологией, он воплощает мотив фатализма и рока, предсказывая смерть и участвуя в судьбах героев. При первом появлении на страницах романа Воланд предсказывает Берлиозу скорую смерть. Перемещаясь в трех временах, он становится связующим элементом между действующими персонажами.

Воланд символизирует мотив всевидящего ока судьбы, он выступает как вершитель судеб вечной борьбы сил зла и добра.

Итак, в романе «Мастер и Маргарита» Михаила Булгакова можно выделить несколько значимых персонажей, чьи личные имена привлекают особое внимание читателей. Среди них выделяются *Мастер, Маргарита, Воланд, Понтий Пилат, Иешуа Га-Ноцри* и другие. Каждое из этих имен несет глубокий символический или идейный смысл, который помогает автору передать свою мысль и образ действия. Через личные имена персонажей автор уделяет внимание их характерам, внутренним мотивам и психологии. Таким образом, личные имена играют важную роль в структуре и содержании романа, помогая читателям погрузиться в мир произведения и понять его глубинный смысл.

**Литература**

1 Суперанская, А. В. Современный словарь личных имён: Сравнение. Происхождение. Написание / А. В. Суперанская. – Москва : Айрис-пресс, 2005. – 384 с.

2 Булгаков, М. А. Мастер и Маргарита / М. А. Булгаков. – Санкт-Петербург : Азбука-Аттикус, 2022. – 480 с.

**УДК 821.161.3-1*М.Танк**

***К. В. Кучарава***

## УВАСАБЛЕННЕ “МАЛОЙ РАДЗІМЫ” Ў ПАЭЗІІ МАКСІМА ТАНКА

*У артыкуле прааналізаваны шэраг вершаў М. Танка, у якіх увасоблены вобраз малой радзімы паэта і асэнсоўваецца яе роля і месца ў яго жыцці, станаўленні і самарэалізацыі як мастака слова, сталенні як творцы. Зазначаецца, што малая радзіма для паэта-класіка з’яўляецца, без перабольшвання, вытокам, крыніцай натхнення і вобразаў, бясцэнным скарбам і апошнім прыстанкам.*

Даследчыкі не аднойчы звярталі ўвагу, што адной са скразных тэм паэзіі М. Танка з’яўляецца тэма Радзімы, адсылаючы пры гэтым да знакамітых словаў самога класіка “*Ёсць адна песня песняў – / Пра Радзіму*” [1, с. 207]. Паэт максімальна шчыра выказаўся ў сваёй любові да роднага краю ў яшчэ адным вершы “Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...”, які служыць, на думку даследчыкаў, “своеасаблівым кодам” [2] да ўсёй творчасці паэта-класіка:

*Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма,*
*І калі мо не на ўсе песні хопіць*
*Адмеранага лёсам часу, ведай:*
*Я дапяю іх, нават калі буду*
*Пясчынкай на тваіх шляхах бясконцых,*
*Сасной на нарачанскім узбярэжжы*
*Ці жаўруком – прадвеснікам жыцця* [3, с. 278].

Як для кожнага чалавека наогул, так і для кожнага паэта радзіма (малая радзіма) – гэта выток і крыніца, якая дае сілы, натхняе, становіцца крыніцай вобразаў... Такім "месцам сілы" для М. Танка, бясспрэчна, з'яўляецца найперш Нарачанскі край, родная Пількаўшчына, апетыя ў такіх вершах, як "Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...", "Мой родны кут", "Крыніца", "Мядзельскі вецер", "Парог, вычасаны з успамінаў…", "Імглой", "Пад мачтай", "У азёрнай старонцы маёй", "Зара над Нараччу", "На шалях азёр", паэмы "Нарач" і шматлікіх іншых.

Радзіма – краіна, горад, вёска, вуліца, дарога, якая вядзе да ўлюбёнага месца. Разам з гэтым, думкі-ўспаміны – родная хата, бацькі, суседзі, сябры і ўсё тое, што дадзена з першых дзён жыцця чалавеку. Так, у вершы "Мой родны кут", назва якога адразу асацыюецца з радкамі паэмы Я. Коласа "Новая зямля", лірычны герой вяртаецца ў сваю маладосць, узгадвае свае "зімовыя прыгоды", "*Калі мы з дзедам тралявалі // Настыўшыя, цяжкія шпалы*" [4, с. 56]. Чытацкая інтуіцыя не падманвае, вечарам лірычны герой М. Танка ("*Кнот укруціўшы, каб шмат газы // Не выгарала, я за кнігай // Сяджу гадзінку, дзве...*" [4, с. 56]) чытае знакамітыя радкі Я. Коласа. Не спіцца доўга на печы і дзеду, які нарэшце не стрымліваецца і звяртаецца да ўнука з пытаннем: "*Цікава, што ты там чытаеш // Што там цябе запаланіла*?" [4, с. 56].

Лірычны герой М. Танка, як у свой час яго коласаўскі папярэднік, шкадуе, што нельга вярнуцца ў часы маладосці:

*О, як шкада мне,*
*Што ты, араты, сейбіт слаўны,*
*Пакінуў рана свой палетак,*
*Што больш табе не прачытаю*
*Я гэтых слоў аб нашым краі,*
*Якi нам воля азарыла,*
*Якi нам стаў яшчэ больш мілы* [4, с. 57].

Да малой радзімы, да першавытокаў адсылае чытача і верш М. Танка "Парог, вычасаны з успамінаў…", які мае і біблейныя алюзіі [5, с. 145]. Парог, дзверы, вокны, уся хата, "пакрытая крыламі ластавак" [5, с. 145], "асталася за мной" зазначае лірычны герой, але яна з ім назаўжды, не вярнуцца, як і не азірнуцца, рызыкуючы пры гэтым застыць "слупом солі", ён не можа. Прыцягальнасць радзімы, яе магнетызм мацней за ўсе перасцярогі:

*Як жа мне не азірнуцца назад.*
*Нават калі б я застыў*
*Слупом солі* [5, с. 145].

У вершы "Крыніца" аўтар чарговы раз падкрэслівае значнасць малой радзімы для кожнага чалавека. Лірычны герой верша, знаходзячыся далёка "ад Бацькаўшчыны", і, як падказвае нам год напісання верша – 1945, не па сваёй волі, каб трапіць "*да родных сваіх крыніц*" і напіцца з іх, "*гатоў з падарожнай кайстры // Сягоння усё аддаць*" [6, с. 73]. Абвостранае пачуццё Радзімы, смутку па ёй прыйшло да лірычнага героя менавіта ўдалечыні ад яе. Бо раней, прызнаецца лірычны герой, ён "*быў калісьці іншым*", не разумеў адметнасці сваёй радзімы і важнасці яе ў сваім жыцці. Цяпер для яго ўсё змянілася:

*Таму я і слаўлю тройчы*
*Радзіму, крыніцы, дрэвы,*
*З якімі, як час настане,*
*Зліецца мой голас і цень,*
*Якія карэннем вып'юць*
*З грудзей маіх ўсе напевы*
*І шумам вяршынь абвесцяць*
*Другі нараджэння дзень* [6, с. 73].

Малая радзіма для М. Танка, бясспрэчна, не толькі самая любімая, але і самая прыгожая, пра што ўпэўнівае паэт чытача ў вершы "Зара над Нараччу". Лірычны герой верша перакананы, што прыгажэйшага пейзажу за ўсход сонца над яго любімым возерам у свеце няма. Ён непаўторны, яго не змаглі б перадаць самыя лепшыя майстры свету:

*Каб сабраць усе скарбы*
*І срэбра, і золата,*
*І з усіх зор у горане*
*Жар распаліць,*
*І, сышоўшыся, ўсе кавалі,*
*Усе волаты*
*Ўзяліся каваць*
*Ранні золак зямлі,*
*Дык не выкулі б гэткай зары,*
*Як над Нараччу...* [3, с. 466].

І ён любіць свой край у любое надвор'е і ў любую з чатырох пораў года ("У азёрнай старонцы маёй"), называючы іх чатырма музыкамі, якіх "разам не бачыў ніхто" [3, с. 329], але кожны з музыкаў па-свойму прыгожы, у кожнага з іх:

*Так пявуча іграюць смыкі,*
*Што аж рэха грыміць над зямлёй,*
*Скачуць птушкі і дрэвы ў бары,*
*Скачуць хмары, вясёлкі, вятры.*
*Хто з іх лепшы музыка, відаць,*
*Век нікому з нас не адгадаць* [3, с. 329].

"З той пары, калі з сэрца маладога Максіма Танка трывожна прараслі першыя вершы, прайшло амаль стагоддзе, у творчым жыцці паэта адлюстравалася безліч дарог, дарог-выпрабаванняў – ланцужных, вогненных, актыўна-грамадзянскіх. Але самай галоўнай з усіх мастакоўскіх "сцежак-дарожак" стала дарога-вяртанне ў родны край, на малую радзіму, Нарачаншчыну" [7] – зазначае маладая даследчыца К. Каляда. І нельга не пагадзіцца з такімі словамі. Вобраз "малой радзімы" паэт пранёс праз усё жыццё. Нарачанскі край, вёску Пількаўшчыну Максім Танк услаўляў у сваіх творах, паказваючы прыклад любові да яе і пакідаючы запавет нашчадкам: "*Помні заўжды аб зямлі той, // Што нарадзіла цябе*" [3, с. 523].

Падсумоўваючы, прывядзём слушныя словы К. Каляды: "З той пары, калі з сэрца маладога Максіма Танка трывожна прараслі першыя вершы, прайшло амаль стагоддзе, у творчым жыцці паэта адлюстравалася безліч дарог, дарог-выпрабаванняў – ланцужных, вогненных, актыўна-грамадзянскіх. Але самай галоўнай з усіх мастакоўскіх "сцежак-дарожак" стала дарога-вяртанне ў родны край, на малую радзіму, Нарачаншчыну" [7].

Сапраўды, вобраз малой радзімы паэт пранёс праз усё жыццё. Нарачанскі край, вёску Пількаўшчыну, сваіх родных і аднавяскоўцаў Максім Танк услаўляў у шматлікіх вершах, паказваючы такім чынам прыклад любові да бацькаўшчыны сваім суайчыннікам і пакідаючы запавет нашчадкам: "Помні заўжды аб зямлі той, // Што нарадзіла цябе" [10, с. 523]. Пра гэта сведчаць і прааналізаваныя ў даследаванні вершы класіка "Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...", "Мой родны кут", "Парог, вычасаны з успамінаў…", "Крыніца", "Зара над Нараччу", "У азёрнай старонцы маёй".

## Літаратура


1 Танк, М. Мой каўчэг : вершы / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 207 с.

2 Нікіпорчык, А. «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...» [Электронны рэсурс] / А. Нікіпорчык // Беларуская думка. – 2012. – № 9. – С. 82–86. – Рэжым доступу: https://beldumka.belta.by/isfiles/000167_230178.pdf. – Дата доступу: 17.04.2024.

3 Танк, М. Збор твораў : у 13 т. Т. 5 : Вершы (1972–1982) / Максім Танк ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы ; рэд. тома В. П. Рагойша; падрыхт. тэкстаў і камент. В. У. Карачун, Т. У. Мархель. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 448 с.

4 Танк, М. Збор твораў : у 6 т. Т. 3 : Вершы 1954–1964 / Максім Танк. – Мінск : Маст. літ., 1979. – 560 с.

5 Танк, М. Збор твораў : у 6 т. Т. 4 : Вершы 1964–1976 / Максім Танк. – Мінск : Маст. літ., 1979. – 720 с.

6 Танк, М. Збор твораў: у 13 т. Т. 2. Вершы (1939–1954) / Максім Танк; НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы; рэд. тома Д. Я. Бугаёў; падрыхт. тэкстаў і камент. С. У. Калядка. – Мінск : "Беларуская навука", 2006. – 566 с.

7 Каляда, К. В. Вобраз "малой радзімы" ў лірыцы Максіма Танка [Электронны рэсурс] / К. В. Каляда // Філалагічная адукацыя ў XXI стагоддзі: мова, літаратура, методыка, міжкультурныя камунікацыі : матэрыялы II-й Міжнар. навук.-практ. канф. (18 красавіка 2018 г.) / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка ; рэдкал.: Л. А. Бяссонава [і інш.]; адк. рэд. Н. В. Заяц. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/bitstream/doc/35242/1/К.%20В.%20Каляда.pdf. – Дата доступу: 17.04.2024.

**УДК 821.161.1-31*А.Платонов**

***Т. А. Мальчикова***

## МОТИВ БЕЗМОЛВИЯ В ПОВЕСТИ А. ПЛАТОНОВА «КОТЛОВАН»

*В качестве объекта исследования в данной статье выступает повесть А. Платонова «Котлован» (1930 г.). Предметом научного интереса является выявление частотности употребления А. Платоновым слов (с корнем -молч-, -груст-, -скук-, -тоск-, -тел- и др.), с помощью которых в повести реализуется мотив безмолвия – один из ключевых мотивов, раскрывающих авторскую концепцию.*

Рождённый на «вековом рубеже», Андрей Платонов оказывается свидетелем Первой мировой войны и Октябрьской революции, застаёт процессы коллективизации и индустриализации, участвует в Великой Отечественной войне. Реакция на эти события становится основой большинства произведений А. Платонова. К слову, часть из них будет запрещена цензурой и увидит свет уже после смерти автора. Одним из наиболее известных произведений А. Платонова стала повесть «Котлован» (1930 г.), опубликованная в Советском Союзе только в 1987 году.

Герои повести «Котлован» – рабочие и крестьяне – с энтузиазмом строят общепролетарское здание (символ светлого будущего), при этом повествование пронизано чувством абсурда и обречённости. Все действующие лица «Котлована» осознают себя не личностями, а частями одного механизма, назначение которого – стать *фундаментом* будущего, но не им самим. К слову, это же отмечает в статье «Повесть "Котлован" в контексте творчества Андрея Платонова» В. Вьюгин: «Читатель "Котлована" сталкивается с людьми, ясно осознающими свою ненужность в новой жизни. <…> Ни одному из платоновских "строителей страны" <…> нет места в будущей жизни, но они упорно и невзирая ни на что продолжают своё дело» [1, с. 15].

Герои повести, роющие котлован, покорные и смиренные внешне, опустошены внутри. Они безразличны как к окружающему, так и к собственному «чувственному», «эмоциональному» миру. Организующим в повести становится мотив безмолвия. Предмет интереса в данной статье – анализ ключевых лексем, с помощью которых реализуется вышеназванный мотив. Рассмотрим следующий ряд часто используемых в повести «Котлован» слов: «молчать» (54 раза), «тело» (45), «скучно» (39), «тоска» (33), «грусть» (31).

Герои произведения, как правило, демонстрируют неспособность к диалогу, равнодушие как к собеседнику, так и к собственной жизни. Например, Вощев чаще «говорит» внутри себя, непрерывно пытаясь найти истину: «Вощеву дали лопату, он сжал её руками, точно *хотел добыть истину* из земного праха» [2, с. 21]. Инженер Прушевский